3 Кодекс Республики Казахстан о браке (супружестве) и семье: Кодекс Респ. Казахстан, 26 дек. 2011 г., N 518-IV // ИС ПАРАГРАФ – ЮРИСТ [Электронный ресурс] / ТОО «ИнфоТех&Сервис». – Режим доступа: https://online.zakon.kz/document/?doc_id=31102748#pos=828;-54. – Дата доступа: 07.04.2019.

4 Тимофеева, Т. В. Суррогатное материнство в зарубежных странах: мировой опыт правового регулирования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://izron.ru/articles/aktualnye-problemy-yurisprudentsii-v-rossii-i-za-rubezhom-sbornik-nauchnykh-trudov-po-itogam-mezhdun/sektsiya-3-grazhdanskoe-pravo-predprinimatelskoe-pravo-semeynoe-pravo-mezhdunarodnoe-chastnoe-pravo/surrogatnoe-materinstvo-v-zarubezhnykh-stranakh-mirovoy-opyt-pravovogo-regulirovaniya/. – Дата доступа: 09.03.2019.

5 Трунов, Л. К. Юридические и практические аспекты суррогатного материнства // Юридический Мир // Юридический консультант. – 2004. – №10. – С. 5–10

6 Бурдо, Е. П. Понятие суррогатного материнства и его правовое регулирование / Е. П. Бурдо. // Пробелы в российском законодательстве. – 2014. – № 4. – С. 54–56.

7 Does Surrogacy Involve Making Families or Selling Babies? / V. Singh, P. Thakur, Byasdev, Anjum // International Journal of Healthcare Sciences. – 2014. Vol. 2, iss. 1. April – September. – P. 129–130.

8 Nilsson E. Merit Making, Money and Motherhood: Women's Experiences of Commercial Surrogacy in Thailand : master thesis in gender studies [Electronic resource]. – Mode of access: https://www.researchgate.net/publication/296653040_Merit_Making_Money_and_Motherhood_Women's_Experiences_of_Commercial_Surrogacy_in_Thailand. – Date of access: 04.03.2019

9 Русанова, Н. Е. Репродуктивные возможности демографического развития [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.demoscope.ru/weekly/2009/0365/analit01.php. – Дата доступа: 09.03.2019.

10 О вспомогательных репродуктивных технологиях: Закон Респ. Беларусь, 07 янв. 2012 г. № 341-З [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 09.03.2019.

11 Кодекс Республики Беларусь о браке и семье: Кодекс Респ. Беларусь, 24 июня 1999 г., № 278-З [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: http://www.pravo.by. – Дата доступа: 10.03.2019.

12 Басалыга, И. С. Правовое регулирование суррогатного материнства в странах ЕС и Республике Беларусь: компаративный анализ / И. С. Басалыга // Международная конференция «Европейский Союз и Республика Беларусь: перспективы сотрудничества»: сб. материалов. – Минск: Изд. центр БГУ, 2014. – С. 249–253.

**УДК 341.215.4-054.73:342.7-054.73**

***Ю. В. Кавалёва***

## ПРАВАВЫ СТАТУС БЕЖАНЦАЎ У МІЖНАРОДНЫМ І ЎНУТРЫДЗЯРЖАЎНЫМ ПРАВЕ

*Артыкул прысвечаны аналізу асобных нормаў беларускага і міжнароднага заканадаўства, звязаных з рэгуляваннем пытанняў прававога статусу бежанцаў у міжнародным і ўнутрыдзяржаўным праве. Праведзены параўнальны аналіз нормаў міжнароднага і нацыянальнага заканадаўства Рэспублікі Беларусь з мэтай ўнясення прапаноў па яго ўдасканаленні.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Праблема бежанцаў – адна з найбольш важных праблем сусветнай супольнасці. Бежанцы з'яўляюцца найбольш уразлівай катэгорыяй людзей, вымушаных змагацца за выжыванне ў экстрэмальных умовах.

Праблема бежанцаў і асоб, якія шукаюць прытулак, мае шматбаковы і глабальны характар, таму любы падыход да яе аналізу і любое яе рашэнне павінны быць ўсёабдымнымі і ўлічваць усе аспекты, а менавіта, ад прычын вымушанага перамяшчэння людзей да распрацоўкі неабходных мер рэагавання ў самых розных сітуацыях.

Фарміраванне прававога статуса бежанцаў і яго юрыдычнае замацаванне ажыццяўлялася доўгі час, на працягу якога міжнародная супольнасць распрацоўвала універсальныя міжнародныя дамовы, стварала сістэму міжнароднага супрацоўніцтва.

У 1951 г. Генеральнай асамблеяй ААН прынятая Канвенцыя аб статусе бежанцаў, дзе даецца вызначэнне паняцця «бежанец» і ўстанаўліваюцца агульныя падставы, на якіх надаецца статус бежанца.

Канвенцыя забараняе якую-небудзь дыскрымінацыю ў дачыненні да бежанцаў. У адпаведнасць з ёй бежанцы карыстаюцца часткай праў нароўні з грамадзянамі прымаючай іх краіны, часта – на тых жа ўмовах, што і замежнікі. Канвенцыя дапускае высылку бежанцаў у інтарэсах дзяржаўнай бяспекі, але забараняе іх вяртанне ў дзяржаву, з якой яны збеглі, баючыся пераследу [1].

Акрамя агульных праў бежанцам павінны надавацца спецыяльныя правы, такія як права выбару месца пражывання і свабоднага перамяшчэння ў межах тэрыторыі краіны-прытулку. Канвенцыя 1951 г. вызваляе бежанцаў ад пакарання за незаконны ўезд на тэрыторыю іншай дзяржавы, аднак пры гэтым яны абавязаныя без прамаруджання з'явіцца да ўладаў з тлумачэннем свайго незаконнага ўезду. Канвенцыя забараняе калектыўную высылку бежанцаў у краіну, дзе іх жыццю пагражае небяспека. Бежанцы, у сваю чаргу, абавязаны выконваць законы краіны знаходжання.

Вызначэнне паняцця «бежанец», дадзенае ў арт. 1 Канвенцыі 1951 года, носіць агульны характар. Згодна з Канвенцяй, бежанцам прызнаецца асоба, якая «баіцца стаць ахвярай пераследу па прыкмеце расы, веравызнання, грамадзянства, прыналежнасці да пэўнай сацыяльнай групы або палітычных перакананняў, знаходзіцца па-за краінай сваёй грамадзянскай прыналежнасці і не можа карыстацца абаронай гэтай краіны ці не жадае карыстацца такой абаронай з прычыны такой асцярогі; або, не маючы пэўнага грамадзянства і знаходзячыся па-за краінай свайго ранейшага звычайнага месцажыхарства ў выніку падобных падзей, не можа ці не жадае вярнуцца ў яе з прычыны такой боязі» [2, арт. 1].

На думку Філіпа Грандзі, былога Генеральнага Камісара БАПОР, у многіх адносінах цяперашняя сітуацыя, у якой даводзіцца абараняць бежанцаў, нашмат менш спрыяльная, чым калі-небудзь у гісторыі УВКБ ААН. Яна характарызуецца шэрагам фактараў, якія перашкаджаюць эфектыўнай міжнароднай абароне. Да такіх адносяцца:

а) варожае асвятленне праблем бежанцаў у СМІ, што прыводзіць да росту расізму, нацызму, ксенафобіі, гвалту ў дачыненні да бежанцаў;

б) заявы аб тым, што састарэлі асновы міжнароднага права, што датычацца бежанцаў;

в) заклапочанасць развітых краін па нагоды выдаткаў, звязаных з прыёмам бежанцаў;

г) зацяжныя сітуацыі, звязаныя з бежанцамі, калі яны шмат гадоў знаходзяцца ў невядомасці, у нестабільных умовах і не могуць дамагчыся ніякага канкрэтнага рашэння;

д) чарада перасоўванняў, звязаная з тым, што бежанцаў вяртаюць назад у краіну, якая яшчэ не дасягнула дастатковай стабільнасці [3].

Адзначым, што ў Рэспубліцы Беларусь створаны неабходныя ўмовы для эфектыўнай работы з асобамі, якія шукаюць прытулак, і бежанцамі, у тым ліку створана адпаведная міжнародным стандартам нарматыўная прававая база, механізм разгляду хадайніцтваў замежнікаў аб прадастаўленні статусу бежанца або дадатковай абароны ў Рэспубліцы Беларусь.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Беларусь пастаянна ўдасканальвае нацыянальную сістэму прытулку, імкнучыся дасягнуць поўнай адпаведнасці нацыянальнага заканадаўства міжнародным стандартам і сучасным тэндэнцыям у галіне абароны вымушаных мігрантаў. Так, у ліпені 2017 года ўступіла ў сілу новая рэдакцыя Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прадастаўленні замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства статусу бежанца, дадатковай абароны, прытулку і часовай абароны ў Рэспубліцы Беларусь».

Змены і дапаўненні накіраваны на ўдасканаленне працэдуры разгляду хадайніцтва аб абароне, скарачэнне тэрмінаў яе правядзення і прадухіленне злоўжыванняў іншаземцамі дадзенай працэдурай. У прыватнасці, дапоўнены крытэрыі вызначэння хадайніцтваў аб абароне як відавочна неабгрунтаваных хадайніцтваў і хадайніцтваў, якія носяць характар злоўжывання, вызначаны выпадкі, калі хадайніцтвы аб абароне, якія разглядаюцца ў агульным парадку, могуць быць разгледжаны ў паскораным парадку, пашыраны пералік правоў, якімі бежанцы карыстаюцца нароўні з грамадзянамі.

Аднак, на наш погляд, асобныя пытанні ўсё яшчэ патрабуюць дапрацоўкі. Гэта, у першую чаргу, тычыцца вызначэння ў законе паняцця «бежанец». Актуальнасць фармулёўкі паняцця ў законе складаецца ў тым, што атрыманне статусу бежанца з'яўляецца фармальным пацвярджэннем права чалавека на абарону або прытулак. Фармальнае ўстанаўленне статусу бежанца цягне за сабой прававыя наступствы, якія заключаюцца ў тым, што становішча пэўнай асобы задавальняе адпаведным прававым крытэрам. Асоба прызнаецца бежанцам, як толькі яе становішча пачынае адпавядаць вызначэнню, таму ўстанаўленне статусу бежанца не робіць чалавека бежанцам, а толькі аб'яўляе яго такім.

У цяперашні час заканадавец Рэспублікі Беларусь ідзе па шляху абазначэння паняційнага апарата ў пачатку закона, што палягчае яго разуменне.

Вывучыўшы Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прадастаўленні замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства статусу бежанца, дадатковай абароны, прытулку і часовай абароны ў Рэспубліцы Беларусь» адзначым, што азначэнне «бежанец» там не дадзена.

Такім чынам, лічым, што арт. 2 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб прадастаўленні замежным грамадзянам і асобам без грамадзянства статусу бежанца, дадатковай абароны, прытулку і часовай абароны ў Рэспубліцы Беларусь» неабходна дапоўніць паняццем «бежанец», так як да яго раскрыцця тэрмін «бежанец» неаднаразова згадваецца ў законе да яго вызначэння ў спецыяльнай главе.

Азначэнне паняцця «бежанец» ўтрымліваюцца ў рэгіянальных дакументах у галіне абароны бежанцаў, сярод якіх найбольш важнымі з'яўляюцца Канвенцыя ОАЕ 1969 г. па канкрэтных аспектах праблем бежанцаў у Афрыцы і Картахенская дэкларацыя 1984 г. аб бежанцах, а таксама ў заканадаўстве розных краін.

Абодва дакументы прадугледжваюць, што асобы, якія ратаваліся ад пагроз, якія ўзніклі ў сувязі з становішчам у краіне іх паходжання, пры пэўных абставінах таксама могуць прызнавацца бежанцамі [4].

Канвенцыя ОАЕ 1969 г. уключае ў сябе вызначэнне бежанца ў адпаведнасці з Канвенцыяй 1951 г. і дадаткова да яго ў пункце (2) артыкула I ўстанаўлівае, што бежанец – гэта «асоба, якая з прычыны знешняй агрэсіі, акупацыі, замежнага панавання або падзей, сур'ёзна парушаючых грамадскі парадак у нейкай частцы краіны або па ўсёй краіне яго паходжання або грамадзянскай прыналежнасці, вымушана пакінуць месца свайго звычайнага пражывання і шукаць прытулак у іншым месцы за межамі краіны свайго паходжання ці грамадзянскай прыналежнасці».

У канцы 70-х – пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя ў шэрагу дзяржаў, асабліва ў Цэнтральнай Амерыцы, узніклі праблемы масавага перамяшчэння людзей з-за ваенных дзеянняў, грамадзянскіх канфліктаў, гвалту і палітычных узрушэнняў. У выніку ў пункце (3) артыкула III Картахенской дэкларацыі 1984 г. аб бежанцах з'явілася наступная рэкамендацыя: «[...] для прымянення ў рэгіёне варта рэкамендаваць паняцце, якое,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

уключаючы ў сябе элементы Канвенцыі 1951 г. і Пратакола 1967 г., адносіць да ліку бежанцаў тых асоб, якія збеглі з краіны, паколькі іх жыццю, бяспецы або свабодзе пагражалі ўсеагульны гвалт, замежная агрэсія, унутраныя канфлікты, масавыя парушэнні правоў чалавека або іншыя абставіны, якія прывялі да сур'ёзнага парушэння грамадскага парадку».

Многія краіны проста прымаюць азначэнне бежанца, якое змяшчаецца ў міжнародных дакументах, да якіх яны далучыліся. Аднак нішто не перашкаджае той ці іншай дзяржаве прыняць больш шырокае азначэнне чым тое, якое патрабуецца ў адпаведнасці з яго міжнароднымі абавязацельствамі. На наш погляд, вызначэнне бежанца, якое змяшчаецца ў Статуце 1950 г., практычна супадае з тым, якое прынялі аўтары Канвенцыі 1951 г.

**Літаратура**

1 Конвенция о статусе беженцев от 28 июля 1951 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://ru.wikipedia.org/wiki. – Дата доступа: 24.04.2019.

2 Женевская Конвенция о статусе беженцев ООН 1951 г. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.un.org/ru/documents/decl_conv/conventions/refugees.shtml – Дата доступа: 24.04.2019.

3 Введение в вопросы международной защиты беженцев: Защита лиц, находящихся в компетенции УВКБ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.unhcr.ru/files/SS1_Protection.pdf. – Дата доступа: 24.04.2019.

4 Определение статуса беженцев: Кто является беженцем [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.unhcr.ru/fileadmin/files/docs/Documents/General_documents_and_manuals.pdf. – Дата доступа: 24.04.2019.

**УДК 347.961:005.591.4**

***Ю. А. Капусціна***

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ НАТАРЫЯЛЬНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў СФЕРЫ ЗАДАВАЛЬНЕННЯ БЯССПРЭЧНЫХ ПАТРАБАВАННЯЎ

*У артыкуле разглядаецца парадак здзяйснення выканаўчага надпісу натарыусам, аналізуюцца нарматыўныя прававыя акты, у адпаведнасці з якімі здзяйсняюцца выканаўчыя надпісы ў Рэспубліцы Беларусь, уносіцца прапанова па ўдасканаленні заканадаўства ў сферы ўнясення змяненняў у зроблены натарыусам выканаўчы надпіс у выпадку рэарганізацыі юрыдычных асоб.*

З развіццём эканамічнага жыцця дзяржавы і грамадства шырокае распаўсюджанне атрымалі адносіны пазыкі, арэндныя і іншыя дагаворныя адносіны, прадпрымальніцтва, сфера крэдытавання і прадастаўлення жыллёва-камунальных паслуг. У гэтых умовах асабліваe значэнне набывае інстытут задавальнення бясспрэчных патрабаванняў, неабходны для забеспячэння абароны маёмасных правоў крэдытораў – выканаўчыя надпісы на дакументах, якія пацвярджаюць наяўнасць запазычанасці, што выконваюцца натарыусамі.

У адпаведнасці з артыкулам 105 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб натарыяце і натарыяльнай дзейнасці», натарыусы ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, здзяйсняюць выканаўчыя надпісы аб спагнанні грашовых сум (запазычанасці) з

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ